# ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ТРАГЕДЫЯ
# Ў АСЭНСАВАННІ СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ

**Г. Ф. Філімонава**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – М. С. Рак, выкладчык*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца адметнасць адлюстравання чарнобыльскай трагедыі ў дакументалістыцы Святланы Алексіевіч (на матэрыяле “Чарнобыльскай малітвы”).
**Ключавыя словы:** чарнобыльская трагедыя; малітва; хроніка; дакументалістыка; спавядальнасць.

Чарнобыльская трагедыя да нашага часу шматпланава асэнсоўваецца і знаходзіць адлюстраванне ў прозе, паэзіі і драматургіі нацыянальных мастакоў слова. Многія пісьменнікі і даследчыкі неаднойчы параўноўвалі яе з вайной: “І наступным пакаленням беларусаў наканавана было мець сваю «вайну», у іх – свае бітвы. Адна з найбольш трагічных і трагедыйных паводле сваіх наступстваў – Чарнобыль. Напрыканцы ХХ ст. катастрофа на Чарнобыльскай АЭС асэнсоўвалася амаль як «восевая падзея» найноўшай гісторыі, пункт адліку «постчарнобыльскага» быцця” [2, с. 14]. Асноўнымі тэматычнымі лініямі ў асэнсаванні названых праблем выступаюць наступныя: пагроза жыццю, бежанства і выгнанне з роднага гнязда, трывожны роздум пра будучыню. Аўтары выкарыстоўваць пераважна змрочныя фарбы, самі ж назвы твораў становяцца вобразамі-сімваламі трагедыі, што ахінула чорным крылом беларускую зямлю (Р. Барадулін “Малітва наступнасці”, С. Законнікаў “Чорная быль”, Я. Сіпакоў “Одзіум”, І. Чыгрынаў “Хто вінаваты” і інш.).

Можна бясконца спрачацца, хто з пісьменнікаў змог найбольш дакладна адлюстраваць усе падзеі жудаснай гісторыі. Несумненным застаецца тое, што Святлана Алексіевіч унесла важкі ўклад у распрацоўку дадзенай тэмы, здолела паглядзець на яе не толькі як мастак, але і як дакументаліст. Перад усім адзначым, што ў аўтара адметная манера напісання тэксту “Чарнобыльскай малітвы”. Яна спалучае ў сабе адзнакі дакументальнага (артыкулы з энцыклапедый, газет, часопісаў, статыстычныя дадзеныя) і мастацкага стыляў, куды ўрываецца паліфанія галасоў сведкаў аварыі.

Кніга была апублікавана ў 1997 г. Яна мае сімвалічны падзагаловак “Хроніка будучыні”, якая раскрывае два аспекты катастрофы: тэхнагенны і сацыяльны, падчас якога на палітычнай карце знікла цэлая звышдзяржава. Аўтар так тлумачыць прызначэнне сваёй кнігі: “*Гэта кніга не пра Чарнобыль, а пра свет Чарнобыля. Якраз пра тое, што нам мала вядома. Амаль нічога. Прапушчаная гісторыя, – гэтак бы я назвала яе. Мяне цікавіла не сама падзея: што здарылася той ноччу на станцыі, хто вінаваты, якія прамаліся рашэнні,*

*колькі тон пяску і бетону спатрэбілася, каб збудаваць саркафаг над д'ябальскай пашчай, а – адчуванні, пачуцці людзей, што дакрануліся да невядомага. Да тайны. Чарнобыль – тайна, якую нам яшчэ давядзецца разгадаць. Мажліва, гэта задача на XXI стагоддзе. Выклік яму. Што ж чалавек там уведаў, угадаў, адкрыў сам у сабе? У сваім дачыненні да свету? Рэканструкцыя пачуцця, а не падзеі*" [1].

У новым выданні 2015 г. у серыі "Галасы ўтопіі" пісьменніца распавядае, што Беларусь з'яўляецца terra incognito – невядомай. З гэтым мы цалкам згодны, бо перад Чарнобыльскай аварыяй Беларусь амаль ніхто не ведаў, а толькі пасля Чарнобыльскай катастрофы пра нас пачынае "казаць увесь свет", часам параўноўваючы гэта з трагедыямі ў Хірасіме і Нагасакі.

Сама кніга падзелена на тры раздзелы ("Зямля мёртвых", "Вянец стварэння", "Захапленне смуткам"), якім папярэднічае "Гістарычная даведка", "Самотны чалавечы голас" і "Інтэрв'ю аўтара з самім сабой аб прапушчанай гісторыі". Больш за ўсё нас уразіла гісторыя-маналог "Самотны чалавечы голас", якая пачынаецца словамі, што напоўніцу перадаюць жах і роспач відавочцаў падзей:

*"Я не ведаю, пра што расказваць... Пра смерць ці пра каханне? Ці гэта адно і тое ж… Пра што?"* [1].

Увесь гэты маналог прасякнуты, з аднаго боку, светлым, шчаслівым і ўзнёслым каханнем, з другога боку, няшчасным і трагічным, якое разрывае сэрца болем і сумам. Спавядальніца задаецца пытаннем: "*Навошта мне такое жыццё, калі побач няма таго, каго я люблю больш за ўсіх на свеце?*" [1]. Думкі пра звядзенне рахункаў з жыццём усё часцей і часцей наведваюць няшчасную жанчыну, нішто не здольнае вярнуць яе да ранейшага. Толькі праз нейкі час боль сціхае, пакідаючы ў сэрцы незагойную рану.

Гэтая гісторыя стала адной са скразных ліній у серыяле "Чарнобыль", дзе вобразы Людмілы і Васіля не пакінулі абыякавымі ніводнага гледача. Святлана Алексіевіч здолела расказаць невялікую прытчу пра вялікае каханне, якое не спыніць нават смерць.

**Літаратура**


1. Алексіевіч, С. Чарнобыльская малітва [Электронны рэсурс] / С. Алексіевіч. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Sviatlana_Aleksijevic/Carnobylskaja_malitva.html #chapter4. – Дата доступу: 21.03.2019.
2. Шаўлякова-Барзенка, І. Л. Проза / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. ; НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск, 2001–2015. – Т. 4, кн. 3. – 2015. – С. 8–35.